Галіна Анатольеўна СУХАВА, настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 5 Віцебска, выдатнік адукацыі, лаўрэат конкурсу "Настаўнік года-2009".

Галіна Анатольеўна — педагог у трэцім пакаленні. Яе педагагічнае крэда: "Калі вы бераце людзей такімі, якія яны ёсць, з усімі характэрнымі ім недахопамі, вы ніколі не зробіце іх лепшымі. Калі вы звяртаецеся да людзей як да ідэальных, вы паднімеце іх на тую вышыню, на якой хацелі б іх бачыць".

Настаўніца лічыць, што вельмі важна ствараць для вучняў сітуацыі свабоднага выбару ў прыняцці рашэнняў і адказнасці за іх выкананне, а паважлівыя і гуманныя адносіны да дзяцей садзейнічаюць выхаванню творчай мэтанакіраванай асобы.

У рамках клуба "Крыштальны журавель" Галіна Анатольеўна актыўна праводзіць майстар-класы і адкрытыя ўрокі. Сваім вопытам настаўніца таксама дзеліцца з калегамі на курсах і семінарах, якія праводзіць Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі.

Апошнім часам Г.А.Сухаву больш цікавяць пытанні выкладання літаратуры. Гэтай жа тэме і прысвечаны сённяшні матэрыял.

Няправільных Эфектыўны

Сёння, калі інфармацыйны паток захоплівае кожнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу, неабходна думаць пра эфектыўныя шляхі арганізацыі ўрока. Праблему эфектыўнага вывучэння літаратуры можна сфармуляваць наступным чынам: як за абмежаваны час, адведзены на вывучэнне мастацкіх твораў, навучыць большаму? Ці як навучыць таму ж за меншы час? Адным з самых моцных стымулаў да перагляду падыходаў і ўласных пазіцый да эфектыўнага навучання літаратуры з'яўляюцца кантроль і ацэнка вынікаў навучання. Для настаўніка ацэнка ведаў і ўменняў вучняў з'яўляецца найбольш складанай задачай. Праблемы аб'ектыўнай дыягностыкі ведаў і ўменняў вучняў на ўроках літаратуры, а таксама распрацоўкі адпаведнага інструментарыю з'яўляюцца актуальнымі і не поўнасцю вырашанымі ў наш час. Нярэдка ўстае пытанне аб аб'ектыўным выстаўленні адзнак (асабліва пры вусным адказе), шырыні ахопу правяраемых ведаў і ўменняў, эканамічнасці метадаў ацэнкі і эфектыўнасці. Наш вопыт практычнай дзейнасці не прэтэндуе на прынцыпова новы шлях у працэсе засваення літаратурных ведаў і ўменняў і іх аб'ектыўнай дыягностыкі, а з'яўляецца адным са спосабаў вырашэння праблемы эфектыўнага навучання літаратуры. Спадзяёмся на дыялог.

Калі чалавек хоча пра нешта даведацца, ён задае пытанні, а не адказвае. Таму кожны настаўнік, які стараецца павысіць эфектыўнасць урока літаратуры праз граматную арганізацыю кантрольна-ацэначнай дзейнасці, не раз задаваў пытанні:

Якія заданні прапаноўваць?

У якой форме праводзіць дыягностыку?

Колькі вучняў з класа апытваць?

Колькі варыянтаў даваць?

Як правяраць выкананыя работы?

Хто павінен правяраць?

Ці ставіць адзнакі?

Безумоўна, адназначных адказаў на пастаўленыя пытанні няма. Наш вопыт пераконвае, што найбольш эфектыўна для навучання літаратуры прымяняць заданні ў тэставай форме. Эфектыўнае заданне дазваляе вучням за адзінку вучэбнага часу дабіцца большага эфекту ў параўнанні з іншымі педагагічнымі заданнямі, хутчэй засвоіць новыя элементы ведаў. Тэставыя заданні на ўроку літаратуры сталі выконваць не толькі кантрольную, але і развіццёвую, і вучэбную функцыю. Зрабіць добрае тэставае заданне да ўрока літаратуры даволі складана. У логіцы невыпадкова гавораць пра культуру пытання, а ў педагагічных вымярэннях — пра культуру фармулявання заданняў у тэставай форме. Аднак значна спрашчае працэдуру складання тэставага задання па літаратуры дыягнастычна сфармуляваная мэта ўрока літаратуры. Для прыкладу прапаноўваю разгледзець урок літаратуры ў пятым класе **"Вершы як вазы" (Параўнальны аналіз вершаў Рыгора Барадуліна "Бацьку" і Васіля Зуёнка "Прыйдзі аднойчы...").**

Мэта ўрока

Мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні будуць **ведаць:** галоўную думку, форму маналога-звароту вершаў Р.Барадуліна "Бацьку" і Васіля Зуёнка "Прыйдзі аднойчы..."; сродкі перадачы пачуццяў паэта (*своеасаблівы рытм, шматлікія вобразы-параўнанні, рэфрэн* — у вершы В.Зуёнка, *недаказ, сказы з простай мовай — у вершы Р.Барадуліна*);

умець супастаўляць вершы, блізкія па жанры і тэматыцы (гл. заданні выніковага кантролю);

садзейнічаць фарміраванню навыкаў аналітычнага і выразнага чытання, развіццю творчага мыслення;

сродкамі матэрыялу ўрока аказаць уплыў на фарміраванне ўнутранага свету вучняў, садзейнічаць выхаванню культуры індывідуальнай і калектыўнай вучэбнай дзейнасці, спрыяць засваенню паняцця "ўважлівае стаўленне да бацькоў".

Канкрэтна прапісаныя крытэрыі засваення ведаў і ўменняў у вучэбнай мэце ўрока дазваляюць скласці дыягнастычнае заданне. Яно можа выглядаць так:

Выніковы кантроль урока "Вершы як вазы"

Вершы Рыгора Барадуліна "Бацьку" і Васіля Зуёнка "Прыйдзі аднойчы..."

Падобныя 1).....

.....

2).....

.....

Для дасягнення пастаўленай мэты плануецца выкарыстаць прыём "Чытанне з ілюстрацыяй", прыём нагляднасці "Вершы як вазы".

Вершы адрозніваюцца сродкамі перадачы пачуццяў паэта (7—8 балаў).

Рыгор Барадулін	Васіль Зуёнак
1.....	1.....
.....	.....
2.....	2.....
.....	.....
3.....	3.....
.....	.....

Для дасягнення пастаўленай мэты плануецца выкарыстаць прыём "Даміно", арганізаваць работу малых груп.

Можаце выразным чытаннем перадаць галоўную думку вершаў (9—10 балаў).

Разбалоўка тэставага задання абмяркоўваецца з вучнямі ў самым пачатку ўрока, яна можа быць заменена ацэнкай — "вельмі добра", "дастаткова", "неабходна карэкціраваць работу на ўроку". Трэба адзначыць, што менавіта адзнака моцна стымулюе актыўную пазнавальную дзейнасць вучняў на ўроку. Спланаваны выніковы кантроль дазваляе настаўніку эфектыўна падабраць метады і прыёмы работы з тэкстам мастацкага твора, загадзя прадумаць, адпрацоўка якіх уменняў будзе найбольш плённай для паспяховага выканання заданняў выніковага кантролю ўрока. Нам здаецца, прыведзеная разбалоўка даволі ўмоўная, хаця і не супярэчыць нормам ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура".

Абапіраючыся на дыягнастычна пастаўленыя мэты ўрока, выбіраем разнастайныя формы пашыраных адказаў, пісьмовых і вусных, каб сабраць інфармацыю пра тое, наколькі вучні дасягнулі вучэбных мэт. Такія тэставыя заданні не прадугледжваюць эталонаў-адказаў, іх значнасць у тым, каб не прыводзіць вучняў да адзінага правільнага вываду, меркавання, а вучыць аргументаваць пазіцыю, будаваць развагі. Галоўнае, каб крытэрыі для ацэнкі былі зразумелымі.

Вось яшчэ адзін прыклад выніковага тэставага задання ўрока "Народная легенда "Нарач" як аснова літаратурнай легенды М.Танка, як дзейсны спосаб раскрыцця таленту паэта".

Мэта

Мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні будуць **ведаць:** мастацкую арыгінальнасць літаратурнай легенды (моўную выразнасць, апісанні прыроды); прыёмы раскрыцця мастацкай арыгінальнасці літаратурнай легенды М.Танка; ідэю твора, змогуць даць правільны адказ на выніковае тэставае заданне ўрока;

умець выбіраць тэкставую інфармацыю для характарыстыкі галоўнага героя, ствараць вобразныя асацыяцыі, выказваць свае адносіны да ўчынкаў герояў.

Задачы асобаснага развіцця: садзейнічаць далейшаму развіццю ўмення ўспрымаць літаратурны твор на эмацыянальна-вобразным узроўні, прымаць пазіцыю і аргументаваць яе пры правядзенні дыскусіі, садзейнічаць фарміраванню навыкаў аналітычнага чытання, развіццю творчага мыслення.

Выніковае тэставае заданне

Як бы вы назвалі легенду Максіма Танка пра возера Нарач:

— плагіят. Чаму? (6 балаў);

— літаратурнай апрацоўкай. Чаму? (7 балаў);

— арыгінальным мастацкім творам. Чаму? (8 балаў);

— актыўна працаваць, смела выказваць свае думкі (няправільных думак не бывае), прадстаўляць работу групы (9 —10 балаў).

Рацыянальна ў выніковае заданне ўрока ўключыць не толькі пытанні, якія вымяраюць ступень разумення зместу мастацкага твора, але і ўключаюць працэдуры ацэнкі дзейнаснага падыходу пры вырашэнні праблемнага кола ўрока.

Даволі цікавай формай тэставага задання як для выніковага кантролю, так і для адпрацоўкі ўменняў аналізу тэксту мастацкага твора можа выступаць анкета.

Урок беларускай літаратуры ў пятым класе